ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 1 2015
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## *ГІСТОРЫЯ*

*УДК 947.6*

*В. В. ДАНІЛОВІЧ*

# УДЗЕЛ МОЛАДЗІ Ў ГРАМАДСКІМ ЖЫЦЦІ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 20–30-я гг. XX ст.

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 28.10.2014)*

Пачатак 1920-х гг. характарызаваўся значным зніжэннем інтэнсіўнасці грамадскага жыцця і пашырэннем пасіўных настрояў у грамадстве Савецкай Беларусі, у тым ліку і сярод моладзі. Такое стаўленне юнакоў і дзяўчын да грамадскага жыцця цалкам зразумела, бо цэлых пяць гадоў у выніку бурлівых рэвалюцыйных і ваенных падзей жыццё грамадства проста віравала. Так, напрыклад, у той час адзначалася, што большасць слухачоў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адрозніваліся сацыяльнай пасіўнасцю і апатыяй [1, с. 207].

Разам з тым палітыка бальшавікоў, накіраваная на змену каштоўнасных арыенціраў грамадства праз вылучэнне на перадавыя пазіцыі грамадскага развіцця пралетарыяту як гегемона і рэзкую крытыку інтэлігенцыі, стварала канфліктную атмасферу ў грамадстве. У выніку ў гарадах ССРБ у пачатку 1920-х гг. адзначаліся непаразуменні і канфлікты паміж рабочай і вучнёўскай моладдзю [2, л. 8, 31].

Нягледзячы на гэта, удзел маладога пакалення ў грамадскім жыцці не спыніўся. Аднак большую грамадскую актыўнасць праяўлялі маладыя людзі ва ўзросце пасля 20 гадоў [3, л. 1], што можна патлумачыць іх большай жыццёвай дасведчанасцю і, як вынік, свядома сфарміраваным жаданнем да самаўдасканалення і прынясення карысці грамадству.

У ССРБ, Віцебскай і Гомельскай губернях вырасла колькасць, ажывіліся арганізацыя і дзейнасць рознага роду прыватных юнацкіх спартыўных клубаў і гурткоў, якія мелі нацыянальны характар, а таксама скаўтызм [3, л. 6; 4, л. 13]. Аднак рашэннем улад рэспублікі недзяржаўныя нацыянальныя спартыўныя аб'яднанні былі ліквідаваны. Увогуле ў Савецкай Беларусі ствараліся розныя апалітычныя гурткі [5, л. 17]. Яны аб'ядноўвалі моладзь па інтарэсах, але масавым уплывам не карысталіся і да таго ж разглядаліся ўладамі як нядобранадзейныя. Такая пазіцыя ўладных структур перашкаджала пашырэнню грамадскіх маладзёжных аб'яднанняў і сведчыла аб жаданні савецкага кіраўніцтва кантраляваць і накіроўваць грамадскую актыўнасць маладога пакалення, што цалкам зразумела.

Значны ўплыў на грамадскае жыццё аказаў выдадзены ЦВК ССРБ 11 кастрычніка 1922 г. дэкрэт «Аб парадку зацвярджэння і рэгулявання таварыстваў і саюзаў, якія не прадугледжваюць мэт атрымання прыбытку, і аб парадку нагляду за імі». Ён моцна абмежаваў свабоднае існаванне грамадскіх арганізацый. Усе дакументы на іх рэгістрацыю спачатку накіроўваліся ў Наркамат унутраных спраў ССРБ, а адтуль – у Дзяржаўнае палітычнае ўпраўленне (ДПУ) Беларусі. Толькі пасля санкцыі ДПУ статут і іншыя рэгістрацыйныя дакументы зацвярджаліся ў міліцыі. Для рэгістрацыі неабходна было прадставіць: статут арганізацыі; спіс яе заснавальнікаў з указаннем іх месца жыхарства, сацыяльнага паходжання і маёмаснага стану, працоўнага стажу з 1914 г., а таксама партыйнасці; указаць месца знаходжання рэгіструемай арганізацыі. Пасля прыняцця дэкрэта была праведзена перарэгістрацыя грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў [1, с. 182].

Зразумела, актыўна ўплываць на грамадскае жыццё маладога пакалення імкнуўся і камсамол, які адводзіў вядучае месца прапагандзе ленінскага вучэння аб саюзе рабочага класа з працоўным сялянствам, іх сумеснай барацьбе з цяжкасцямі аднаўленчага перыяду за поўную перамогу сацыялізму [6, с. 105]. Камсамольскія арганізацыі ССРБ, Віцебскай і Гомельскай губерняў вялі агітацыйную і прапагандысцкую дзейнасць у падтрымку праводзімай дзяржаўнай палітыкі [7, л. 58; 8, л. 1; 9, л. 3]. Напрыклад, у 1921 г. яны паспяхова правялі кампанію 1 мая, у якой прыняла ўдзел вялікая колькасць беспартыйнай моладзі [4, л. 64]. Толькі ў 1923 г. камсамольцамі былі праведзены 27 мітынгаў, лекцый і дакладаў у гарадах Савецкай Беларусі, 208 – у сельскай мясцовасці; 1 экскурсія ў горадзе і 5 – на перыферыі; 40 гутарак і чытак газет у гарадах, 651 – на вёсцы; пастаўлена 7 жывых газет у гарадах і 6 – у сельскай мясцовасці; выпушчана 6 насценных газет у гарадах і 12 – на вёсцы. Усяго падобнай працай было ахоплена амаль 13 тысяч юнакоў і дзяўчын [10, л. 15]. Канечне, гэта была зусім невялікая лічба ў адносінах да агульнай колькасці моладзі Савецкай Беларусі, асноўная частка якой заставалася па-за ўплывам саюза, але і сам ён у той час налічваў вельмі малую колькасць членаў. Нягледзячы на гэта, сцвярджалася, што камсамол ССРБ трымаў пад сваім уплывам 75 % моладзі рэспублікі [11, л. 9, 81], што, на наш погляд, з'яўляецца яўным перабольшаннем.

Камсамольцы ССРБ удзельнічалі ў судах па справах моладзі, адстойваючы яе эканамічныя і грамадскія правы, разгортвалі адпаведныя кампаніі [2, л. 64].

Паспяхова прайшло святкаванне юбілею КСМБ у 1923 г. Толькі ў Мінску ў ім удзельнічалі 5 тысяч чалавек [12, л. 76]. У 1924 г. святкаванне гадавін ЛКСМБ таксама ахапіла вялікую частку беспартыйных маладых людзей. У Віцебску, Магілёўскай і Полацкай акругах адбыліся канферэнцыі беспартыйнай рабоча-сялянскай моладзі, на якіх значная колькасць удзельнікаў заявілі аб жаданні ўступіць у камсамол [13, л. 22, 51].

Неабходна адзначыць, што ЦК ЛКСМБ меў прадстаўнікоў у Цэнтральных камітэтах Таварыства ўзаемадапамогі, Добраахвотнага таварыства сяброў хімічнай абароны і хімічнай прамысловасці, Міжнароднай арганізацыі дапамогі рэвалюцыянерам (МАДР) і Таварыства сяброў паветранага флоту [14, л. 134; 15, л. 63, 66; 16, л. 24]. Камсамольцы ўдзельнічалі ў стварэнні і працы рэспубліканскага Таварыства пацярпелых ад інтэрвенцыі і акупацый [14, л. 41]. У лістападзе 1924 г. прадстаўнік ЦК камсамола рэспублікі ўдзельнічаў у Краязнаўчым з'ездзе БССР [15, л. 48].

Але часта выбраныя ў розныя грамадскія структуры камсамольцы не ведалі, як працаваць і што рабіць [13, л. 20]. Яны адрываліся ад камсамола, хаця на грамадскую працу вылучаліся ячэйкамі і камітэтамі саюза і ў сваёй дзейнасці павінны былі падпарадкоўвацца ім [17, л. 15, 17]. Гэта сведчыць аб адсутнасці ў саюзе арганізацыі працы камсамольцаў у грамадскіх структурах і фармальным падыходзе да гэтай справы.

З ліпеня 1924 г. актывізаваўся ўдзел у грамадскім жыцці навучэнцаў педтэхнікумаў БССР [18, л. 17]. Адпаведна актывізаваў сваю дзейнасць сярод настаўнікаў і камсамол. У лістападзе–снежні 1924 г. камсамольцы ўдзельнічалі ў настаўніцкіх з'ездах у Савецкай Беларусі [13, л. 20]. Аднак, нягледзячы на гэта, сярод настаўнікаў адзначаліся спробы самастойна весці працу сярод моладзі, незалежна ад камсамольскай арганізацыі: стварэнне гурткоў і г. д. [19, л. 15], што сведчыць аб яшчэ недастатковым уплыве ЛКСМБ у навучальных установах.

У 1925 г. паляпшэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва, шырокая дзейнасць усіх грамадскіх арганізацый у сувязі з курсам кампартыі на максімальнае ажыўленне іх працы павялічылі грамадскую актыўнасць моладзі [20, л. 29; 21, л. 2]. Пры гэтым шмат яе грамадскіх арганізацый знаходзіліся пад уплывам і кіраўніцтвам ЛКСМБ [22, л. 34], яго ўздзеянне на маладое пакаленне значна вырасла [23, с. 17–18]. Увогуле ўдзел саюза ў грамадскай працы значна павялічыўся, як і колькасць камсамольцаў у грамадскіх арганізацыях.

Тым не менш назіралася замкнёнасць камсамола на выхаваўчай працы ўнутры саюза, што адрывала яго ад беспартыйнай моладзі і супрацьпастаўляла адных іншым. Замест усемагчымага спрыяння і дапамогі мясцовым кааператыўным і іншым грамадскім арганізацыям часта назіраліся спробы ЛКСМБ падмяніць іх сабой, узяць на сябе адміністрацыйна-камандныя функцыі, што падрывала аўтарытэт саюза ў грамадстве [24, л. 58; 25, л. 9]. Дэманстрацыі і нават карнавалы праводзіліся камсамольцамі аднатыпна [20, л. 4], колькасць падпіскі моладзі на газеты пад ціскам

камсамола вырасла, але яны фактычна не чыталіся [26, л. 20]. Адзначаліся няўважлівыя адносіны камсамольцаў да ўцягвання беспартыйных маладых рабочых (асабліва старэйшых узростаў) у актыўную грамадскую працу (у прафсаюзах, таварыствах, на прадпрыемствах) і вылучэння на выбарах у структуры грамадскіх арганізацый лепшых з іх; адсутнасць гнуткіх форм працы сярод беспартыйных маладых працаўнікоў прыватных прадпрыемстваў [21, л. 3]. Увогуле сувязь камсамола з беспартыйнай моладдзю характарызавалася як вельмі дрэнная [26, л. 17]. Былі выпадкі, калі маладыя людзі заяўлялі, што лепш уступіць у ячэйкі МАДРа, чым у ячэйкі ЛКСМБ [27, л. 63].

Сярод камсамольцаў грамадскіх арганізацый характэрнымі з’явамі былі слабая працаздольнасць, адрыў ад ячэйкі і перагружанасць (удзел у некалькіх грамадскіх структурах) [28, л. 26]. Аўтарытэт і праца членаў саюза ў грамадскіх арганізацыях не ўсюды былі аднолькавыя. Часам з-за несправядлівых учынкаў яны не карысталіся аўтарытэтам [27, л. 68]. Вельмі малы працэнт камсамольцаў быў выбраны ў камітэты ўзаемадапамогі [29, л. 45]. Члены саюза слаба ўдзельнічалі ў расцэначна-канфліктных камісіях на прадпрыемствах, бо яны працавалі ў рабочы час [30, л. 31]. У некаторых рэгіёнах камсамольцы, выдзеленыя ці выбраныя ў грамадскія арганізацыі, працяглы час іх не наведвалі [31, л. 53].

У цэлым удзел камсамола ў грамадскім жыцці лічыўся недастатковым. Грамадская праца ячэек ЛКСМБ канцэнтравалася ў прафсаюзах, кааперацыі, МАДРы, Авіяхіме і шэфскіх таварыствах. У добраахвотных таварыствах камсамольцы былі больш актыўнымі [32, л. 151].

Увогуле значная колькасць членаў саюза была ўцягнута ў розныя добраахвотныя таварыствы. Але часта гэта было фармальнае сяброўства. У прыватнасці, камсамольцы складалі большую колькасць у актыве МАДРа і Авіяхіма. Ячэйкі ЛКСМБ, асабліва на вёсцы, арганізоўвалі ячэйкі гэтых грамадскіх арганізацый. Але камсамол недастаткова ўдзельнічаў у ажыўленні прапагандысцкай працы таварыстваў, ячэйкі саюза часта падмянялі ячэйкі таварыстваў, не ўлічваліся імкненні, інтарэсы і ініцыятывы радавых камсамольцаў [33, л. 22].

Перад уладнымі структурамі ставілася задача перашкаджаць дзейнасці не звязаных з ЛКСМБ аб’яднанняў моладзі [34, л. 9]. Таму меліся выпадкі адміністрацыйных ганенняў на грамадска актыўных маладых людзей [26, л. 20]. У выніку ў пачатку 1926 г. назіраўся спад грамадскай актыўнасці маладога пакалення [35, л. 10].

У 1927 г. ячэйкі ЛКСМБ удзельнічалі ў кааперыраванні беднаты, працоўнай дапамозе сем’ям чырвонаармейцаў, удовам. Камсамольцы ў адпаведных органах адстойвалі інтарэсы беднаты пры размеркаванні пазык і крэдытаў. Аднак лічылася, што ў цэлым саюз слаба ўдзельнічаў у гаспадарчай дапамозе беднаце праз грамадскія арганізацыі [36, л. 205].

Камсамольцы таксама ўваходзілі ў склад Беларускага таварыства Чырвонага крыжа. Аднак у 1927 г. адзначалася, што ЛКСМБ недастаткова вялася растлумачальная праца аб задачах Чырвонага крыжа, асабліва на вёсцы [37, л. 23]. З 1928 г. у ЦК Беларускага таварыства Чырвонага крыжа, а таксама ў склад яго вайскова-санітарнай камісіі і камісіі па аздараўленні працы і быту ўваходзілі прадстаўнікі рэспубліканскага камсамола [38, л. 265; 39, л. 45 – 46].

Большасць тагачаснай моладзі Савецкай Беларусі пражывала ў сельскай мясцовасці. Напрыканцы першай паловы 1920-х гг. сярод гэтых маладых людзей таксама назіраўся рост грамадскай актыўнасці. Так, у Гомельскай губерні вясковай моладдзю стваралася шмат ініцыятыўных груп [17, л. 22]. Іх шырокая сетка ўтварылася і ў паветах губерні, далучаных да БССР. Кампартыяй ставілася задача лепшых з членаў груп прыняць у камсамол, а астатніх распусціць [14, л. 19], што сведчыць аб жаданні камуністаў кантраляваць арганізацыйныя памкненні маладога пакалення і незацікаўленасці іх у самаарганізацыі моладзі. У выніку ў канцы кастрычніка 1924 г. бюро ЦК ЛКСМБ як станоўчы момант адзначала скарачэнне колькасці сялянскіх моладзевых ініцыятыўных груп [14, л. 154].

Па ўсіх сацыяльных праслойках вясковай моладзі назіралася актыўнасць у павелічэнні цягі ў ЛКСМБ і грамадскія арганізацыі [21, л. 10]. Разам з тым у пачатку 1926 г. у шэрагу рэгіёнаў БССР працягвалі існаваць непадкантрольныя ЛКСМБ гурткі сялянскай моладзі, якія вялі грамадскую працу [28, л. 7].

На вёсцы слабай была грамадская актыўнасць батрацкай і бядняцкай моладзі (хутчэй за ўсё з-за цяжкага матэрыяльнага становішча), у адрозненне ад серадняцкай і кулацкай [22, л. 37].

Бядняцкая моладзь заставалася слаба арганізаванай і амаль зусім не ўдзельнічала ў сходах беднаты, дзе ўвогуле мала абмяркоўваліся моладзевыя пытанні [40, л. 49 – 50]. Кулацкая моладзь на вёсцы імкнулася ўплываць на серадняцкую, уваходзіць у грамадскія арганізацыі і тым самым падрывала працу ячэек ЛКСМБ [41, л. 587].

Кампартыя ставіла перад камсамолам як адну з асноўных задач у яго грамадскай працы паляпшэнне дзейнасці кааперацыі і сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі [17, л. 36]. І гэта задача выконвалася. Камсамольскі актыў удзельнічаў на вёсцы ў кааперацыі і сялянскіх камітэтах узаемадапамогі [22, л. 44]. Многія камсамольскія ячэйкі самі выступалі ініцыятарамі стварэння кааператываў і камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. К канцу 1925 г. большасць сямей камсамольцаў БССР з’яўляліся пайшчыкамі кааператыўных таварыстваў, а ў Багушэўскім раёне гэты паказчык быў нават стопрацэнтным [6, с. 138 – 139, 170].

Сяляне ў асобных рэгіёнах нават вылучалі камсамольцаў у грамадскія арганізацыі [31, л. 71]. Актыўна падтрымлівала камсамол моладзь вясковай беднаты [22, л. 45].

Шэраг поспехаў ЛКСМБ меў у вясковай спажывецкай кааперацыі, але слаба ўдзельнічаў у сельскагаспадарчай кааперацыі і меліярацыйных таварыствах [41, л. 587].

Пасля таго, як шмат членаў саюза на вёсцы ўступілі ў грамадскія арганізацыі і сталі прымаць актыўны ўдзел у іх працы, заможныя сяляне пачалі ганенні на гэтых камсамольцаў [42, л. 121].

У шэрагу акруг акрамя ўцягвання беспартыйнай моладзі ў працу хат-чытальняў праводзіліся дні сялянскай моладзі і дні сялянскай дзяўчыны. Але з мэтай пашырэння грамадскай актыўнасці маладых людзей не выкарыстоўваліся нефармальныя формы, такія як пасядзелкі ці вячоркі. Былі выпадкі, калі падчас святкавання 1 мая камсамольцы праганялі сялян з палявых работ [31, л. 47]. Вельмі слабай была масавая праца ЛКСМБ сярод батрацкай моладзі, зусім рэдка праводзіліся яе сходы, хаця ва ўсіх акругах даволі актыўна прайшлі канферэнцыі батрацкай моладзі [13, л. 30, 36], што сведчыць аб нежаданні ці няздольнасці камсамольскага кіраўніцтва і актыва развіваць гэту працу.

Усяго за 1926 г. камсамолам было праведзена 199 раённых канферэнцый і 2645 сельскіх сходаў, на якіх прысутнічала ў большасці батрацкая моладзь, але яе актыўнасць лічылася недастатковай [30, л. 48; 33, л. 15].

Увогуле ў сярэдзіне 1920-х гг. ЛКСМБ прымаў значны ўдзел у працы сельскіх камітэтаў узаемадапамогі [27, л. 63]. Так, калі ў 1925 г. у сельскіх камітэтах узаемадапамогі налічвалася 355 камсамольцаў, а ў раённых – 52, то ў 1926 г. у камітэты ўзаемадапамогі было абрана 1684 камсамольцы, з іх 696 (8 %) упаўнаважанымі, 653 (10,3 %) членамі сельскіх камітэтаў, 330 (19,7 %) членамі раённых і акруговых камітэтаў [43, л. 78 – 79]. Як бачым, у камітэтах узаемадапамогі высокі працэнт камсамольцаў знаходзіўся на адказнай працы, хаця яна была бясплатнай [33, л. 21], што сведчыць аб наяўнасці ў членаў саюза нематэрыяльных прыярытэтаў дзейнасці і жадання прынесці карысць грамадству. Аднак, нягледзячы на гэта, у 1927 г. вясковая моладзь заставалася слаба ўцягнутай у камітэты сялянскай грамадскай узаемадапамогі, кааперацыю і г. д. [44, л. 4].

У кастрычніку – снежні 1924 г. назіраўся ўздым грамадскай актыўнасці яўрэйскай моладзі [13, л. 48]. У выніку павялічвалася актыўнасць моладзі мястэчак, яе цяга да арганізаванасці і грамадскай работы [25, л. 23]. Пры гэтым у мястэчках шмат грамадскіх арганізацый мелі антыкамсамольскі характар [20, л. 10], што было выклікана, на наш погляд, актывізацыяй дзейнасці сіяністаў. ЛКСМБ фактычна ўхіліўся ад процідзеяння ім. Камсамольцы мястэчак у гэты час у асноўным вялі працу ў навакольных вёсках і адмоўна ставіліся да саматужнай моладзі (у большасці яўрэйскай), бо лічылі саматужнікаў спекулянтамі. Адпаведна назіралася адмоўнае стаўленне да камсамола саматужнай моладзі. Увогуле ячэйкі ЛКСМБ у мястэчках займалі пасіўную пазіцыю. Больш таго, ужо ў 1925 г. местачковымі камсамольскімі ячэйкамі амаль не вялася і масавая праца сярод сялянскай моладзі ўскраін мястэчак [13, л. 30, 48, 50]. Такое становішча можа сведчыць аб нежаданні камсамольскага кіраўніцтва сапернічаць з сіяніcцкім рухам і незацікаўленасці ў пашырэнні ўплываў саюза сярод саматужнікаў і сялянства. Толькі ў 1929 г. ЛКСМБ некалькі ажывіў працу сярод саматужнай моладзі. Быў скліканы шэраг яе канферэнцый у Мінску, Віцебску і Бабруйску [45, л. 97].

У гарадах камсамольцы сістэматычна праводзілі сходы беспартыйнай рабочай моладзі, якой на чэрвень 1925 г. у БССР налічвалася 8 тысяч [25, л. 4]. Аднак агульныя канферэнцыі беспартыйнай моладзі былі несістэматызаваныя. У большасці акруг Савецкай Беларусі для масавай працы сярод

рабочай моладзі саюз выкарыстоўваў вячэрнія школы [13, л. 30]. У выніку ў пачатку 1926 г. каля 40 % рабочай моладзі не было ахоплена ўплывам камсамола [22, л. 141], хаця дзейнасць саюза ў першую чаргу павінна была адпавядаць менавіта яе інтарэсам. Праблемы ў гэтай дзейнасці ЛКСМБ назіраліся і напрыканцы 1920-х гг. Так, у 1929 г. удзел саюза ў перавыбарчай кампаніі страхавых кас даў нязначныя вынікі [46, л. 315].

Перад камсамолам са снежня 1921 г. ставіліся і задачы развіцця дзіцячага грамадскага руху праз піянерскую арганізацыю. З гэтай мэтай камсамольцы стваралі дзіцячыя клубы [3, л. 5]. У 1922 г. КСМБ выдзеліў 50 камсамольцаў у якасці важатых. Цэлыя брыгады членаў саюза вялі адпаведную працу, асабліва сярод дзяцей рабочых, сірот і беспрытульнікаў. Пры ЦК КСМБ было створана спецыяльнае бюро па кіраўніцтву работай сярод дзяцей. З дапамогай кампартыі ў 1923 г. былі арганізаваны курсы па падрыхтоўцы піянерскіх інструктараў і важатых з ліку камсамольцаў [6, с. 121 – 123].

У пачатку 1920-х гг. працягвалася расслаенне на прыхільнікаў і ворагаў савецкай улады такой дзіцячай і моладзевай арганізацыі, як скаўты [47, л. 7]. Першыя з цягам часу ўвайшлі ў піянерскую арганізацыю, а другія паступова распаліся і зніклі як арганізацыйная структура. Аднак пэўны час піянерская праца камсамола заставалася несістэмнай і фактычна была пушчана на самацёк.

Увага КП(б)Б да піянерскага руху ўзмацнілася ў пачатку 1925 г., бо кампартыя лічыла, што з-за росту грамадскай актыўнасці маладога пакалення існуе небяспека страты класавай сутнасці гэтай арганізацыі. Была пастаўлена задача далучыць піянераў да працы партыі і камсамола [48, л. 16].

У выніку актывізавалася праца ЛКСМБ па ўмацаванні піянерскай арганізацыі. Так, вясной 1925 г. прайшлі курсы падрыхтоўкі піянерскіх работнікаў, якія скончылі 100 чалавек [20, л. 7, 13]. У акругах былі праведзены 10-дзённыя камсамольскія курсы піянерважатых для вёскі. Праз іх прайшлі 252 чалавекі. У гарадах 200 камсамольцаў былі вылучаны на піянерскую работу. Яшчэ 3 члены саюза былі накіраваны ў Маскву на Цэнтральныя курсы піянерскіх работнікаў [13, л. 44].

Як вынік на 1 лістапада 1925 г. сярод піянераў Савецкай Беларусі налічвалася 2298 (5 %) членаў і 460 (1 %) кандыдатаў у члены ЛКСМБ. Пры гэтым 70 % атрадаў дзейнічалі пры камсамольскіх клубах і ячэйках. Сярод піянерважатых сяляне складалі 44 %, рабочыя – 34 і іншыя – 22%. [48, л. 15]. Як бачым, піянерскі рух асабліва актыўна пашыраўся на вёсцы. Хутчэй за ўсё гэта было выклікана жаданнем павялічыць колькасць яго ўдзельнікаў сярод беларусаў, бо дагэтуль піянерскі рух быў пераважна яўрэйскім па складзе.

Цікава параўнаць змены, якія адбыліся ў піянерскай арганізацыі. Так, калі сярод старшынь піянерскіх бюро на чэрвень 1924 г. было 20 % рабочых, 70 % служачых, 10 % сялян, 10 % беларусаў, 90 % яўрэяў, 60 % членаў КП(б)Б, то на канец 1925 г. – 40 % рабочых, 30 % служачых, 30 % сялян, 50 % яўрэяў, 40 % беларусаў, 10 % палякаў. Калі на чэрвень 1924 г. камсамольцаў у піянерскай арганізацыі ўвогуле не было, то на канец 1925 г. іх колькасць налічвала 6 %, усяго ж піянераў камсамольскага ўзросту – 17 % (з іх значная колькасць несялянскага і нерабочага паходжання), але на вёсцы камсамольцаў сярод піянераў было толькі каля 2 % [28, л. 86 – 87].

На піянерскую работу часта выдзяляліся непрыдатныя камсамольцы [13, л. 46]. Піянерскія работнікі былі слаба падрыхтаваныя, асабліва важатыя, недастаткова распаўсюджвалі пралетарскі ўплыў [16, л. 32]. Лічылася, што ў іх складзе было невялікае партядро (23 %, хаця гэта ў 10 разоў больш, чым у той час у ЛКСМБ) і слабае камсамольскае ядро, у якім большасць складалі камсамольцы, прынятыя ў саюз у 1924 – 1925 гг. З аднаго боку, у шэрагу камсамольскіх арганізацый затрымліваўся пераход піянераў у саюз, каб не пераўтварацца ў дзіцячую арганізацыю, а з другога боку – часта ў ЛКСМБ перадаваліся непадрыхтаваныя піянеры [48, л. 16, 19]. Сярод камсамольцаў у піянерскай арганізацыі адзначаліся моманты недысцыплінаванасці [28, л. 87]. Сама актывізацыя піянерскай работы адбывалася не ўсюды. Так, на чэрвень 1925 г. некаторыя ячэйкі саюза мелі па 3 піянерскія атрады, а некаторыя – ніводнага [25, л. 5]. Пры гэтым лічылася, што камсамольскія ячэйкі недастаткова кіруюць піянератрадамі (асабліва на вёсцы) [49, л. 80].

У 1926 г. ужо ў кожнай піянерскай арганізацыі былі створаны камсамольскія ядры (на вёсцы яны былі слабейшыя, чым у гарадах) [28, л. 8]. Аднак і ў 1930 г. адзначалася, што камітэты і ячэйкі ЛКСМБ нездавальняюча кіруюць піянерскім рухам [50, л. 11]. Сітуацыя з гэтым выправілася толькі ў 1930-я гг.

Напрыканцы 1920-х гг., грунтуючыся на поспехах сацыялістычнага будаўніцтва, працягвала расці грамадская актыўнасць моладзі Савецкай Беларусі [50, л. 9; 51, л. 1].

Адным з яе напрамкаў стала стварэнне з 1926 г. пры добраахвотных пажарных таварыствах атрадаў юных дружыннікаў (пачынаючы з васямнаццацігадовага ўзросту) для навучання пажарна-тэхнічным ведам [32, л. 136]. Акрамя гэтага, ячэйкі ЛКСМБ таксама арганізоўвалі пажарныя дружыны [28, л. 26]. Аднак напрыканцы 1930-х гг. адзначалася, што камсамольскія арганізацыі калгасаў і саўгасаў зусім не ўнікалі ў працу добраахвотных пажарных дружын, не цікавіліся супрацьпажарнымі мерапрыемствамі і не дапамагалі ўзмацненню пажарнай аховы [52, л. 38], што сведчыць пра адсутнасць у камсамоле сістэмнай працы ў гэтым кірунку.

З 1931 г. пачаў павялічвацца ўплыў ЛКСМБ на шырокія колы беспартыйнай працоўнай моладзі [53, л. 108]. Так, саюз паспяхова вёў працу сярод моладзі аб’яднання глуханямых [54, л. 53]. З падачы камсамола СНК БССР 3 жніўня 1931 г. зацвердзіў палажэнне аб секцыях моладзі пры аддзелах Усебеларускага аб’яднання глуханямых (УАГ). У адпаведнасці са статутам, моладзь да 18 гадоў не мела права з’яўляцца сябрамі УАГ і абслугоўвалася без ільгот, якія прадстаўляліся членам аб’яднання. Секцыі мелі ўласныя фінансавыя сродкі, якія фарміраваліся з сяброўскіх і ўступных узносаў, ахвяраванняў, даходаў ад розных збораў, датацый і адлічэнняў [38, л. 235, 240–241]. Гэта сведчыць аб пераходзе камсамола на якасна новы ўзровень пашырэння сваіх уплываў у грамадстве праз адстойванне правоў і інтарэсаў маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Пашыралася прадстаўніцтва ЛКСМБ і ў іншых грамадскіх структурах. Напрыклад, у 1934 г. саюз увёў свайго прадстаўніка ў Рэспубліканскі савет Таварыства за авалоданне тэхнікай [55, л. 98].

Разам з тым меліся і пэўныя недахопы ў грамадскай працы камсамола. Так, у першай палове 1930-х гг. дрэннай заставалася праца ЛКСМБ сярод моладзі ў гандлёвай сферы [56, с. 4]. У сярэдзіне 1930-х гг. складаным было становішча і з прыцягненнем у грамадскую працу дзяўчын. У 1935 г. ЦК ЛКСМБ не выканаў большасць мерапрыемстваў, прынятых ЦК УЛКСМ для паляпшэння працы сярод жаночай моладзі [57, л. 76]. Але з наступнага года грамадская актыўнасць камсамолак і беспартыйных дзяўчын пачала расці [58, с. 1]. У 1936 г. камсамольцы і моладзь БССР актыўна ўдзельнічалі ў абмеркаванні праекта новай сапраўды дэмакратычнай канстытуцыі СССР і цалкам яго падтрымалі [6, с. 218–219].

Увогуле ў 1930-я гг. характэрнай рысай дзейнасці камсамольскіх арганізацый была іх высокая актыўнасць у грамадскім жыцці, імкненне ўцягнуць у яго шырокія масы юнакоў і дзяўчын. Пры гэтым камсамол карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод іх. Уключэнне ў рады актыва ЛКСМБ вялікай колькасці моладзі спрыяла больш шырокаму развіццю грамадскіх пачаткаў у дзейнасці камсамольскіх арганізацый, наблізіла іх да жыцця, працы, інтарэсаў і запытаў маладых людзей [6, с. 224, 226].

Такім чынам, пачатак 1920-х гг. характарызаваўся значнай пасіўнасцю юнакоў і дзяўчын у грамадскім жыцці. Адначасова палітыка бальшавікоў, накіраваная на змену каштоўнасных арыенціраў грамадства, выклікала канфлікты і сярод прадстаўнікоў маладога пакалення.

Нягледзячы на гэта, удзел моладзі ў грамадскім жыцці не спыніўся. У Савецкай Беларусі ў гэты час ствараліся розныя, пераважна апалітычныя гурткі і групы. Але жаданне савецкага кіраўніцтва кантраляваць і накіроўваць грамадскую актыўнасць маладога пакалення, што цалкам зразумела, перашкаджала пашырэнню ініцыятыўных грамадскіх маладзёжных аб’яднанняў.

Актыўны ўплыў на грамадскае жыццё моладзі імкнуўся аказваць камсамол праз арганізацыю розных мерапрыемстваў і пашырэнне свайго прадстаўніцтва ў грамадскіх арганізацыях. Але часта ў саюзе адсутнічала сістэмная арганізацыя працы камсамольцаў у грамадскіх структурах і назіраўся фармальны падыход да гэтай справы. Таму павелічэнне колькасных паказчыкаў не заўсёды суправаджалася высокай якасцю грамадскай працы.

У 1925 г. паляпшэнне матэрыяльнага становішча насельніцтва, шырокая дзейнасць усіх грамадскіх арганізацый у сувязі з курсам кампартыі на максімальнае ажыўленне іх працы павялічылі грамадскую актыўнасць маладога пакалення. Аднак уладныя структуры перашкаджалі дзейнасці не звязаных з ЛКСМБ аб’яднанняў моладзі, пры гэтым выкарыстоўваліся адміністрацыйныя ганенні на іх прадстаўнікоў. У выніку зноў адбыўся спад грамадскай актыўнасці маладога пакалення.

Напрыканцы 1920-х гг., грунтуючыся на поспехах сацыялістычнага будаўніцтва, грамадская актыўнасць моладзі пачала зноў расці, развіваючыся ў вызначаным уладамі рэчышчы. У 1930-я гг. узмацніўся і ўплыў ЛКСМБ на шырокія колы беспартыйнай працоўнай моладзі, пашырылася прадстаўніцтва саюза ў грамадскіх структурах.

Як бачым, рост грамадскай актыўнасці моладзі на працягу 1920-х гг. быў няўстойлівы. Ён стабілізаваўся толькі ў 1930-я гг., калі, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, галоўную ролю ў арганізацыі грамадскага жыцця маладога пакалення канчаткова замацаваў за сабой камсамол.

## Літаратура


1. *Ляхоўскі У.* Ад гоманаўцаў да гайсакоў. Чыннасць беларускіх маладзёвых арганізацый у 2-й палове XIX ст. – 1939 г. / У. Ляхоўскі. – Беласток: Беларус. гіст. т-ва; Вільня: Ін-т беларусістыкі, 2012. – 483 с.
2. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 18.
3. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 12.
4. РДАСПГ. – Ф. М-1. – Воп. 23. – Спр. 32.
5. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 13.
6. Очерки истории Ленинского комсомола Белоруссии. – Минск: Беларусь, 1975. – 536 с.
7. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 7.
8. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 6.
9. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 7.
10. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 33.
11. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 22.
12. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 19.
13. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 37
14. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 33.
15. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 35.
16. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 51.
17. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 27.
18. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 28.
19. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 131.
20. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 44.
21. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 46.
22. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 53.
23. Резолюции и постановления IX съезда КП(б)Б. – Минск: Политиздат, 1926. – 457 с.
24. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 39.
25. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 42.
26. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 133.
27. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 122.
28. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 54.
29. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 185.
30. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 355.
31. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 121.
32. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 62.
33. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 66.
34. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 59.
35. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 58.
36. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 174.
37. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 370.
38. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 130.
39. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 369.
40. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 73.
41. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 64а.
42. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 64.
43. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 193.
44. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 363.
45. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 465.
46. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 424.
47. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 2. – Спр. 29.
48. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 48.
49. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 49.
50. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 99.

51. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 78.
52. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 147б.
53. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 126.
54. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 128.
55. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 136.
56. 5 год работы камсамола Беларусі. Справаздачны даклад сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Аўгустайціса // Чырвоная Зьмена. – 1936. – № 57. – 17 сак. – С. 2–5.
57. НАРБ. – Ф. 63п. – Воп. 1. – Спр. 137.
58. Учора на з'ездзе. Ранішняе пасяджэнне 14 сакавіка // Чырвоная Зьмена. – 1936. – № 55. – 15 сак. – С. 1.

*V. V. DANILOVICH*

**YOUNG'S SOCIAL ACTIVITY IN THE SOVIET BELARUS DURING THE 20th-30th YEARS OF XX CENTURY**

## Summary

Article deals with problem of the young's social activity in the Soviet Belarus. Beginning of the 1920th has been characterized by considerable passivity of boys and girls in the public life. Komsomol was eager to provide the active influence on the social life of young people. But often there was no systematic organization of the Komsomol in social structures, and there was a formal approach to this work. In the mid of 1920th the extensive activities of public organizations in connection with course of the communist party to a maximum recovery of their work increased social activity of the younger generation.

However the power structures prevented of activities of unrelated to the Komsomol associations of youth. As a result again there was a decline of the younger generation's public activity. At the end of the 1920th achievements of socialist construction stimulated the growth of youth's social activity.

In 1930th, thanks to the government support, the Komsomol finally has secured a major role in the organization of younger generation social life.